– контроль остаточных знаний и умений спустя определенное время после завершения изучения дисциплины.

Важным условием для эффективной организации самостоятельной работы является использование модульной и рейтинговой систем оценки знаний, тестовых и художественно-творческих систем, способствующих адекватной оценке уровня приобретенных компетенций.

В первую очередь следует отметить рейтинговую систему контроля, применяемую во многих учреждениях высшего образования. Использование рейтинговой системы позволяет добиться более ритмичной работы студента в течение семестра, а также активизирует познавательную деятельность студентов путем стимулирования их творческой активности. Также введение рейтинга позволяет преподавателю раскрыть свои педагогические возможности и воплотить идеи для совершенствования учебного процесса.

Новые подходы к организации образовательного процесса имеют целью подготовку специалиста, способного работать в новых условиях, учиться всю жизнь, применять знания на практике, успешно осуществлять профессиональную деятельность.

**Э. В. Шчадрына,** *выкладчык*
*кафедры этналогіі і фальклору*

# БЕЛАРУСКІЯ КАЛЯНДАРНЫЯ ГУЛЬНІ ЯК СРОДАК АПТЫМІЗАЦЫІ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ЭТНАФАНІЧНЫ ПРАКТЫКУМ»

Як сведчыць рэчаіснасць, да апошніх часоў у «натуральным» (вясковым) асяроддзі беларуская традыцыйная культура сама сябе трансліравала. Напачатку XXI ст. ва ўмовах уціску культуры масавай, пашырэння інфармацыйнай прасторы, што актыўна прапагандуе новыя стандарты мыслення і паводзін, яна выключна самастойна трансліраваць сябе здольна не заўсёды. Такое становішча сёння патрабуе дапамогі з боку спецыялістаў-захавальнікаў традыцыі, многія з якіх зараз атрымліваюць адукацыю па напрамку «фальклор» спецыяльнасці «народная творчасць». Адна з асноўных прафіліруючых дыс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыплін – «Этнафанічны практыкум» – складаецца з двух частак («Клас фальклорнага выканальніцкага майстэрства» і «Этнафонія») і выкладаецца з першага па чацвёрты курс. Для выкладання дысцыпліны кафедрай этналогіі і фальклору распрацаваны вучэбныя праграмы [1], [2].

Сэнс дзейнасці спецыялістаў, якія займаюцца народным мастацтвам, каштоўнасцямі этнічна абумоўленых стандартаў мыслення і паводзін, – спрыяць іх далейшай трансляцыі. Вядома, пажадана з найменшымі якаснымі стратамі. Гэта з'яўляецца і мэтай іх дзейнасці, якая здольна быць дасягнута праз выхаваўчы і навучальны працэсы, метадычную і выдавецкую работу. Таму пры правядзенні практычных заняткаў па этнафанічным практыкуме абмінуць каляндарныя гульні немагчыма, бо яны: а) звязаны з пэўным рэгіёнам, дакументальнай мясцовай традыцыяй (падзвінская і цэнтральнабеларуская калядная гульня «Жаніцьба Цярэшкі», усходнепалескае «Ваджэнне Казы» і г. д.), якая сама па сабе сродак інтэлектуальнага развіцця і этнакультурнага выхавання; б) скіраваны на актыўныя формы адпачынку (карагодныя і танцавальныя рухі, фізічныя спаборніцтвы) і шмат даюць для фарміравання этнічна афарбаваных форм паводзін. Каляндарная гульня пры дакладна выверaным дыдактычным падыходзе здольна істотна аптымізаваць правядзенне практычных заняткаў па дысцыпліне «Этнафанічны практыкум».

Каб надаць вучэбнаму працэсу дакументальную аснову, знаёміць студэнтаў-фалькларыстаў з лепшымі і сапраўды аўтэнтычнымі формамі народнага мастацтва, на кафедры этналогіі і фальклору быў падрыхтаваны шэраг тэматычных праграм, заснаваных на вывучэнні, пераймaнні і далейшай трансляцыі каляндарных гульняў. Гэта «Каляды Гомельскага Падняпроўя» на матэрыяле Веткаўшчыны (выкладчык Э. В. Шчадрына, 2011 г.), «Вялікдзень у Далосцах» на матэрыяле Падзвіння (дацэнт В. В. Калацэй, 2012 г.), «Заходнепалескае Купалле» на матэрыяле Брэстчыны (старшы выкладчык Н. В. Петухова, 2013 г.), «Цярэшка па-глыбоцку» на матэрыяле Падзвіння (старшы выкладчык Т. А. Пладунова, 2014 г.). У працэсе падрыхтоўкі гэтых праграм студэнты набылі аналітычныя і даследчыя навыкі працы с пэўнай каляндарнай традыцыяй, якія спатрэбяцца ім як будучым фалькларыстам-практыкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У кантэксце сцвярджэння тэзісу пра тое, што каляндарныя гульні шмат даюць для фарміравання этнічна афарбаваных форм паводзін, варта падкрэсліць наступнае. Магчыма доўга спрачацца па тэме «Што такое культура?» альбо «Што з яе складальнікаў найбольш важнае, грунтоўнае, найбольш уплывае на агульны стан грамадства?». Сёння аднак падаецца бясспрэчным, што культура – перш за ўсё форма арганізацыі мыслення і паводзін. І калі ўлічыць, што чалавек як складаная інфармацыйна-энергетычная сістэма на 95–98 % складаецца з інфармацыйна-энергетычных слаёў падсвядомасці [3, с. 292], тым, хто агітуе за духоўнае адраджэнне і росквіт народнай культуры, варта пачаць рухацца не толькі ў пераносным, але і ў прамым сэнсе. Больш падрабязна пра сэнс апошняга сказа: вербальныя заклікі вядуць да кароткачасовай увагі аўдыторыі (пакуль інфармацыя не будзе «зацёрта» больш новай і жыццяважнай); саўдзел аўдыторыі ў генетычна змадэляваных, апрабаваных папярэднімі генерацыямі фізічных дзеяннях пакідае біяэнергетычны адбітак, які жыве значна больш і мае больш значны ўплыў на будучыя паводзіны. Таму каляндарныя гульні сучаснай моладзі якасна і арганічна фарміруюць этнічную самаідэнтыфікацыю, ствараюць і доўга захоўваюць адчуванне прыналежнасці асобы да культуры ўласнага народа на фізічным і эмацыянальным узроўнях.


*1.* Этнафанічны практыкум. Раздзел 1. Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства : вучэб. праграма па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (Фальклор), спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 22 с.

*2.* Этнафанічны практыкум. Раздзел 2. Этнафонія : вучэб. праграма па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (Фальклор), спецыялізацыі 1-18 01 01-05 01 Этнафоназнаўства. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 20 с.

*3. Яркина, Т. И.* Биоэнергетические основы человека и его жизнедеятельности / Т. И. Яркина, Л. В. Звонарева // Социально-педагогический колледж ; под ред. М. П. Гурьяновой. – М. : Соционовация, 1995. – 320 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ